Первый день она провела в семье у подруги, которой обо всем рассказала ночью, улегшись с ней в одной кровати, и заливая подушку слезами. Подруга пожалела ее, поплакала вместе с ней

и обещала никому ничего не говорить, но не утерпела и на утро сказала матери. Мать выслушала ее, строго поджала губы и, пройдя в кухню, где девушка умывалась под краном, сказала:

Вот что, милая, у меня семейный дом, а не заведение. У меня дочь на выданьи. Поищите себе угол в другом месте.

Она перешла к другой подруге и жила там три дня; на четвертый подруга сказала, не глядя ей в глаза, что к ним из деревни приезжают родные и дальше оставаться здесь ей не удобно. Она ушла и отсюда и стала переходить из дома в дом, мучаясь оскорбле-

"...повторяя знакомые заученные слова о дороге, которую нужно открыть женщине.

ниями и той презрительной и высокомерной жалостью, с какою начинали относиться к ней все, кому доводилось узнать о ее несчастьи. Теперь уже, действительно, на фабрике тыкали в нее пальцами и шептались за ее спиной. Для нее стало мучительным показываться на людях, и, едва кончив работу, она закоулками уходила за город и до глубокой ночи бродила в глухих и мрачных оврагах, где выли бездомные и одичалые собаки.

Через неделю ее неожиданно вызвали к начальнику местного уголовного розыска.

Ваш папаша,—сказал, пригласив ее сесть и запирая дверь, начальник,—ваш папаша попросил меня выяснить обстоятельства этого... этой вашей истории. Частным образом, так сказать, как партиец партийца. Так вот, барышня, бросьте ломаться и говорите прямо, чья это работа.

Вы не имеете права!—сказала она,—я буду жаловаться.

Но, но!—строго сказал он,—ты, брат, не того! В холодную захотелось?

Он мучил ее около двух часов, бесцеремонно копаясь во всех мучительных для нее интимных подробностях дела, и отпустил ее, ничего не добившись толком, скверно выругавшись и пообещав на прощанье так-ли иначе взять ее „на пистолет".

Скоро случайно узнала, что комсомолец, который бросил ее, сошелся уже с другой девушкой, с которой бок-о-бок она работала на фабрике около двух лет. Они были в хороших отношениях, и она решила пойти поговорить с ней, обо всем рассказать ей. Та усмехнулась и сказала:

— Ну, и что же? Он мужчина, а не монах. Тебя бросил, а меня не бросит. Значит, удержать не умела, сама себя и вини.

Тогда смутно чувствуя какую-то общественную уродливость, элементы какого-то морального разложения во всех этих поступках и разговорах, она пошла к секретарю партийной заводской ячейки. Тот выслушал ее и пожал плечами.

— Ну, так чего же ты, собственно, хочешь? Будет ребенок, заставим платить алименты. А если все впустую кончилось, по партийной линии тут делать нечего. Партия не может копаться в грязном белье.

— Что-же, значит, так и должны комсомольцы поступать, так и хорошо, значит?

— Об этом в уставе не говорится. Да ведь он силой тебя и не волок? Зачем далась? Сама далась, сама и виновата, не маленькая.

Она ничего не нашла ответить и ушла, отчетливо ощущая глубокую фальшь и неправду в его словах, но не умея этого выразить.

Слухи о том, что с нею случилось, поползли по городу, и ее история получила широкую огласку. Скоро отца ее и брата вызвал к себе секретарь городского партийного комитета.

— Что же вы,—с упреком сказал он,—оба партийцы, передовая семья, а дореформенные времена возрождаете? Зачем выгнали ее из дому?

— Она, шлюха!—угрюмо сказал отец,—всю нашу фамилию опозорила.

— С ребятами под кустами валяется—подтвердил брат.

— А ты там не лежал?

— Я, другое дело.

— Чего другое? Смотри, мы на твои похождения сквозь пальцы глядели, но придется к случаю,—есть о чем тебе в книжку вписать. Моралист нашелся! Почему тебе можно, а ей нельзя?

— Она-ж девица, — сказал отец,—она должна себя сохранять.

— А сынок, значит, пусть щелкает направо и налево? Так ведь он же таких вот, как она, и калечит. Эх, ты! Постыдился бы, ведь сознательный рабочий. Пожалеть надо человека.

— Если партия прикажет, я ее возьму,—хмуро сказал отец,—я от партии не отступник. Но косы я ей оборву. Уж тут не запретите.

— Там посмотрим, оборвешь или нет.

— Смотреть нечего, оборву.

— Ладно, еще поговорим. Стало быть, найдешь ее и возьмешь домой.

— Я с ней жить не буду,— сказал брат,—тогда я уйду.

— Ну и уходи, и из комсомола уйдешь.

— Чего же вы мне грозите? Почему вы тому не грозите, кто ее общарапал?

— И ему попало.

— Что ему попало? Он по заводу петухом ходит, ребятам подробности рассказывает, где у нее мягко, а ребята облизываются.

— „Вот, говорят, дошлый парень, он нигде не упустит, где подержаться можно". Герой сволочь! Вызвали потом к вам сюда, хотели на вид поставить, а он говорит: „Что-ж, что комсомолец, и комсомольцу тоже хочется". Тогда все стали смеяться, и он чистый вышел. Нас срамите, а сами тоже хороши!

— Ну, ну, ты того...—смутившись сказал секретарь,—кончен разговор.

Вернуться домой девушка отказалась: она сняла комнатушку в пригороде у одинокой старухи-бобылки и замуровалась там, как сурок в норе. Она выходила только на работу, избегая встречаться и разговаривать с людьми, и целыми вечерами лежала, не зажигая света и кутаясь в платок на кровати. Старуха слышала часто, как она плакала, тихонько зарываясь в подушку, и стонала во сне.

Постепенно история стала забываться, однако, и ее горе потеряло первоначальную остроту; жизненный инстинкт брал свое, ее потянуло к свету, к солнцу, на улицу, к людям.

В первый раз когда она рыскнула показаться в новом огромном, только-что отстроенном заводском клубе—там стоял доклад о новом быте и шла оживленная горячая дискуссия. Голос, звучавший с эстрады, показался ей знакомым; она протиснулась ближе и вздрогнула, увидев человека, причинившего ей столько страданий. Он говорил о культурности в быту, о том, насколько хорошо ежедневно чистить зубы, регулярно менять белье и мыться до пояса по утрам—и находил, что с этого надо начинать переустраивать жизнь. Он был красив, говорил легко и уверенно, и девушки улыбались ему с мест. Потом выступило еще несколько человек, и вслед за ними на эстраду вышла мать и привычно стала говорить о старых предрассудках и повторять знакомые, заученные слова о дороге, которую надо открыть женщине.

В середине ее речи человек, сидевший в президиуме справа от председателя, нагнувшись к нему, сказал шопотом:

— Это, ведь, кажется, та самая, помнишь? Зачем ее выпустили? Неловко,—ведь все знают.

— Ну, забыли уже,—равнодушно сказал председатель,—чорт с ней, пусть говорит.

И мать говорила, и ей аплодировали шумно, и художник, как всегда, зарисовал ее для газеты...

Примечание. Перепечатано из журнала „Прожектор" № 24.

Арганізуем дапамогу бяднячкам у жніво.

Набліжаецца час уборкі ўраджаю. Перад усімі грамадзкімі арганізацыямі і працоўным сялянствам стаіць задача—як мага хутчэй убраць яго. Прапусьціш дарагі час—глядзіш—зярно высыпалася, а часам на полі засталося гніць. Гэтага ні ў якім разе нельга дапусьціць. Мы павінны даражыць кожным пудам хлеба. Сваечасовая ўборка дасьць таксама магчымасьць сваечасова абсеяцца на зіму.

Вельмі важна дапамагчы бядняцкім гаспадаркам, удовам, сем'ям чырвонаармейцаў, інвалідаў, асабліва грамадзянскай вайны, сваечасова ўбраць ураджай. Дэлегацкія сходы, жаночы актыў, сельсаветчыцы і наогул батрацка-бядняцкая і серадняцкая жаночая маса павінна прасачыць за тым, каб Камітэт Узаемадапамогі арганізаваў дапамогу бядняцкім гаспадаркам.

Камітэту трэба арганізаваць уборачныя дружыны з сяброў КСУ, партыйцаў, комсамольцаў, дэлегатаў і інш.

Камітэт павінен сваечасова забясьпечыцца ўсімі сродкамі для збору ўраджаю: уборачнымі машынамі, канямі і іншымі прыладамі.

З свайго боку бяднячка і сераднячка могуць аказаць дапамогу ў збору ўраджаю: арганізаваць талоку, гуртом выйсьці на поле і за якія-небудзь некалькі гадзін можна ўбраць альбо зьвезьці ўраджай; для гэтага можна арганізаваць і нядзельнік.

Дапамагаючы ўдаве, бяднячцы, сям'е чырвонаармейца ўбраць ураджай, мы вызвалім іх ад неабходнасьці пакланіцца кулаку; кулацкая ласка вядома. За гэту дапамогу бяднячка будзе гнуць сьпіну на кулацкай паласе; узімку не адну ночку будзе сьляпіць вочы над кудзельлю кулачыхі.

Дапамагаючы арганізована беднаце, мы вызваляем яе ад сувязі, ад уплыву кулацкага.

Дэлегацкія сходы, жаночы актыў павінны быць у першых радох арганізатараў уборкі ўраджаю. Гэта пытаньне трэба дэлегаткам загадзя абгаварыць на сваіх сходах, заслухаць даклад Камітэту Узаемадапамогі: як ён падрыхтаван да збору ўраджаю, абгаварыць, чым жаночы актыў можа дапамагчы Камітэту.

Увага зь
Юных Ленінца

Камуністычнае выхаваньне зьмены—справа усей савецкай рам

Усебеларускі зьлёт піанэраў будзе праходзіць у Менску, у жніўні месяцы. Зьлёт павінен будзе падняць палітычную актыўнасьць піанэраў, праверыць удзел дзяцей у сацыялістычным будаўніцтве, уцягнуць у рады піанэраў новыя тысячы дзяцей працоўных і прыцягнуць увагу шырокіх працоўных мас да справы камуністычнага выхаваньня дзяцей.

Пяцьсот дзяцей рабочых і сялян упяршыню зьбяруцца на Ўсебеларускі зьлёт. Зьлёт ня толькі праверыць работу піанэр-арганізацыі, а будзе адначасова смотрам таго, што зроблена для камуністычнага выхаваньня дзяцей нашай партыяй, камсамолам, дзяржаўнымі ворганамі, прафсаюзамі. Прадстаўнікі 79 з паловаю тысяч, арганізаваных у 2.065 піанэр-атрадаў, дзяцей рабочых і працоўных сялян Беларусі на зьлёце заслухаюць справаздачу нашай грамадзкасьці аб тым, што ёю зроблена для палепшаньня навучаньня ў школах, для большага ахопу школаю батрацка-бедняцкай дзетвары, дапамогі ў арганізацыі лягэроў, пляцовак, дзіцячых клюбаў, рабочых пакояў, гарачых сьнеданьняў у школе.

Зьлёт павінен быць разгортваньнем вялікага паходу за дзяцей. Мы часта много говорым аб дзецях, але мала робім. Трэба перайсьці ад слоў да справы.

Вось чаму работніцы, сялянкі і ўсе працоўныя жанчыны павінны прыняць самы актыўны удзел у падрыхтоўцы да піанэрскага зьлёту. Трэба на дэлегацкім і агульным жаночым сходзе заслухаць даклады Бюро юных піанэраў, правадыроў атрадаў, аддзелу нарасьветы, каператыўных і прафэсыянальных арганізацый; даведацца, як гэтыя арганізацыі выхоўваюць і абслугоўваюць дзяцей; унесьці свае прапановы аб тым, як палепшыць работу піанэр-атраду, школ, дзіцячых ясьляў, пляцовак і інш.

Неабходна, праверыць, як самі працоўныя жанчыны дапамагаюць у выхаваньні нашай зьмены. Ёсьць многа выпадкаў, калі работніцы і сялянкі-маткі зусім ня цікавяцца працай школы, наведваюць яе толькі па выкліку загадчыка; ніколі ня бываюць і зусім ня ведаюць, што робяць дзеці ў піанэр-атрадзе ці клюбе.

Бываюць выпадкі калі нават у вялікіх рабочых клюбах дзецям ня толькі не адводзяць асобных пакояў, але нават гоняць іх з сянец, дзе дзеці туляюцца, каб праводзіць сваю працу. Такое зьявішча нецярпіма. У кожным клюбе, хаце-чытальне, павінна быць адведзена месца, дзе-б піанэры і наогул дзеці працоўных маглі працаваць, набываць веды. Гэта адцягне дзяцей ад вуліцы, дзе часьцяком яны, ня маючы прытулку, вучацца хуліганіць.

Трэба дамагацца працоўнага выхаваньня дзяцей у школе, каб дзеці вучыліся там ня толькі пісьменнасьці. Працоўныя жанчыны павінны першымі выказацца за дабраахвотныя адлікі, адпрацоўку некалькі гадзін — у карысьць арганізацыі гэтых майстэрань, дзіцячых клюбаў, пакояў і іншыя.

Цяперашняя падрыхтоўка да зьлёту павінна па-

Тав. Хацкевіч сярод піанэраў у лягэры.

У карысьць дет. дома.

У Быхаве дэлегацкі актыў апрацаваў каляктыўны гарод.

Увесь ураджай пойдзе ў карысьць детдома. Узяліся за працу 12 дэлегатак пры дапамозе агранома, садавода і жанарганізатара. Угнаеньне і насеньне раздабылі і арганізована працуем на агародзе: полем, абкапываем, дагледжваем добра.

Камсамольцы ўзяліся таксама працаваць, дык на іх гародзе ўсход так травой зарос, што за ёй нічога ня відаць.

Кілессо.

Взяли шефство над детьми революционерами.

Недавно в Гомель прибыли двое мальчиков 15 и 12 лет— дети румынского революционера

...ЛЁТУ ...АЎ



...й рамадзкасьці.

...анец тэй няўважлівасьці да дзяцей, ...ракалася дагэтуль.

...цам, сялянкам і ўсім працоўным ... неабходна прыняць удзел у провадах ...на зьлёт.

...рускі зьлёт піанэраў працягнецца чатыры ...ты час удзельнікі зьлёту правядуць экс... буйнейшыя прадпрыемствы Менску, фіз...ія і іншыя спаборніцтвы.

...ы, прыяжджаючыя на зьлёты, будуць разь...па кватэрам рабочых. Гэта робіцца для ...даць магчымасьць піанэрам яшчэ бліжэй ...з жыцьцём, працай на прадпрыемстве ... у сацыялістычным будаўніцтве рабочага, ... растлумачыць рабочым аб задачах піа...зацыі і зьлёту.

...таварыскі прыём піанэраў у рабочай сям'і ... ад жанчыны. Таму да зьлёту трэба рых...к да сьвята „Чырвоных гальштукаў". ... рабочай сям'і піанэр павінен сустрэць ... прыём і ўмовы, у якіх бы ён адчуваў ...і як дома.

... Саюз будуе сацыялізм. Патрэбна вялікая ...рыхтоўцы камуністычных рэзэрваў, якія ...рацягваць справу гэтага вялікага будаў...

...ныя жанчыны, больш увагі да справы ...ня новага чалавека.

Вітаньне піанэрам.

Вітае зьмену
Ліпеньскае сонца,
Каскады променьняў
Асмуглы песьцяць твар.
Вясна ў вачох
І радасьці бясконца—
На піанэрскі зьлёт
Сьпяшае дзетвара...
Таварыш, друг—
Работніца, сялянка!
У кожнай сьвята сёньня
на душы:
На аксамітнай
Сонечнай палянцы
Магутнай сілаю
Іскрацца галасы.

З чым параўнаць?
Яны не параўнальны,
То краскі лепшыя
Цудоўных мігаў—дзён,
То лепшы дар жыцьця,
Жывое парываньне,
То гарту мужнага
Квяцістых крозаў—плён.
Каскады променьняў
Вітаюць нашу зьмеву
— Будаўнікоў і творцаў
Новых Дзён.
Дык дружна строймася
ў зьвеньні
Насустрач ім хутчэй ідзём!

З. Бандарына.

...Ивануши, замученного румын...ими палачами. Эти мальчики ...дут жить в Авиобригаде, а ...ша женская ячейка МОПР'а ...линейного района приняла над ...ми шефство.

Теперь яч. МОПР'а домашних ...зяек занята изысканием средств ... воспитание этих детей. Жен...ины постановили: каждой вно...ть ежемесячно не менее 10 коп. ...ожно и больше по желанию), ...к как ячейка теперь 350 чле...в, то мы надеемся с нашей за...чей справиться; кроме того, ...дут изыскиваться средства пу...м устройства вечеров, лоте...й и пр.

Дети т. Ивануши давали слово ...ть верными борцами за рево...оцию.

Тюфяева.

Гомель.

Быхаўскія сялянкі апрацавалі каляктыўны гарод у карысьць дзіцячага сада.

КАК ЖИВЕМ, ЧТО ДЕЛАЕМ

Крепнем потому, что работаем в коллективе.

В нашей коммуне „Красное Знамя“ в 1924 г. было всего 24 коровы, 13 лошадей.

Старательно работали коммунары, за то хозяйство коммуны росло с каждым годом. Сейчас количество рогатого скота увеличилось на 50 голов, лошадей на 24, выстроены дома, приобретен трактор.

Растет коллек. хозяйство потому, что коллективом работаем. Только в коллективах мы сумеем быстрее поднимать сельское хозяйство и улучшать наш быт.

Коммунарка **Х. Гавриленко.**

Городокский р-н.

Падпісаліся і чытаць будзем.

Вёска Кожанавічы хоць і мяжуецца з раённым асяродкам, але адсталая, някультурная вёска.

Пагутарылі мы з сялянамі, растлумачылі ім аб часопісі „Белрабсялянка“—жанчыны адгукнуліся—унеслі грошы на часопісь 15 асоб.

Тут-жа пастанавілі вылучыць настаўніка, ці наогул больш адукаванага чалавека, які-б рэгулярна хадзіў і абучаў іх пісьменнасьці.

Трахімовіч.

Жыткавіцкі раён.

Далі адпор заможнікам.

У кампаніі па вучоту аб'ектавага абкладаньня жанчыны-бяднячкі прымалі актыўны удзел. Па нашаму Цяцерынскаму сельсавету кампанія вучоту аб'ектавага абкладаньня пачалася з 25/V.

Калі разьмяркоўвалі скідку па падатку, заможнікі крычалі: „Трэба вызваліць ад падатку сёлета толькі тых, хто летась быў не вызвалены“. Гэта казаў прадстаўнік заможнікаў в. Глубокага, Будкевіч Пархвен, а яго сябры на ўсю хату крычалі: „Правільна“!

У вёсцы Храпых Данілаў Дарахвей сын урадніка былога кажа: У нас усе роўныя, а гультаёў некалькі ёсьць, дык іх вызваляць ні ў якім разе нельга.

Тыя-ж крыкуны торкалі сябе ў сьпіс вызваленых ад падатку.

Але-ж беднота арганізавана дала адпор спробам заможнікаў скарыстаць палёгку, якую савецкая ўлада дае беднаце.

Т. К.

Цяцерынскі с.-с.

Маем вайсковыя веды.

У вайскова-санітарны гурток запісалася 28 жанчын. Гурток займаўся адзін раз у тыдзень. Кіраваў доктар Левін і старшыня Райасо Богдановіч.

Зараз гурток арганізован у вайскова-санітарную дружыну.

Рубахін.

Сьвіслач, Бабр. акр.

ЧАГО БЫЦЬ НЕ ПАВІННА.

Бойкі, п'янства і ўсякае паганства.

Ніякай антырэлігійнай працы не вядзецца ў в. Скураты. Жанчыны-актывісткі і рады-б працаваць, але ня маюць ніякага накірунку. Шаптухам і знахарам ніхто ня перашкаджае запужваць сялянак.

Тройца прайшла ў бойках і п'янстве. Нават некаторыя камсамольцы самі хадзілі п'яныя.

Усей культурнай працы у нас—гэта чытка „Белрабсялянкі“.

Трэба каб камсамольская ячэйка і іншыя арганізацыі дапамаглі наладзіць працу ў в. Скураты.

Сялянка **Ф. П.**

Ганьба такім настаўнікам.

Настаўнік Дукорскай 7-годкі Рубан за парадамі па сельскай гаспадарцы ходзіць не к аграному, а к папу. Гэта было не адзін раз.

Ня месца такім настаўнікам у школе. Якія з іх тады „выхаваўцы“ моладзі.

Вучань.

Рудзенск.

Шэфы, дзе вы?

Шэфы Рудзенскага с.-с. забыліся аб падшэфнай вёсцы. Ніякай працы ня вядуць і ўжо 2 месяцы ня былі ў Рудзенску.

Хто іх разбудзіць? **Ч.**

Трэба зьнішчыць таўхатню.

Пры атрыманьні тавараў у Рудзенскім Спажыўтаварыстве заўсёды таўхатня. Людзі стаяць цэцымі днямі. Трэба над гэтым пытаньнем задумацца праўленьню і ўстанавіць чаргу.

Ведаючы.

Рудзенск.

Лён топчуць.

Сяляне в. Горкі, Магілеўскай акр., пасеялі лён і папары, каля ярыны, бо там зямля добра ўгноена.

Дэлегаткі гэтай вёскі: Тарасева Ганна, Дзюўбанава Дунька, Парсоўскач Ганна, Андрэянка Вольга падгавораць другіх дзяўчын і, калі пасуць раніцай кароў, ідуць таптаць льны. Топчуць і яшчэ зьдзеквацца.

Савецкая ўлада імкнецца расшырыць пасяўную плошчу, а нашы дэлегаткі замест дапамогі шкодзяць гэтай справе.

Знаючы.

Крысы общественное добро грызут.

Кончанская кооперация помещается в амбаре. Нет окон, пыльно, грязно. Крысы поели мануфактуру и муку. Кооперативная комиссия и не думает за дело браться.

Мария Жуланова.

Городокский р-н.

Растлумачце жанчынам працаваць якім чынам.

Сярод нашых жанчын ніякай працы не праводзіцца, хоць вёска наша на адлегласьці 3-х вёрст ад раёну. Дэлегатак абралі гадоў тры таму назад, яны ўжо забыліся, што дэлегаткамі зьяўляюцца.

„Свой“.

В. Кругі, Аршан. акр.

У наступным нумары будзе надрукавана, што зроблена па допісам рабселькорак.



КООПЕРАЦЫЯ

Праз кааперацыю — палепшым жывёлагадоўлю.

На асноўныя прадукты жывёлаводзтва: малочныя (малако, сыр, масла, сьмятану, тварог) і мясныя (мяса, сьвініну, сала, птушку, яйкі) ёсьць вялікі попыт і добрыя цэны, а таму жывёлагадоўля ў сельскай гаспадарцы павінна заняць вялікае мейсца.

Што трэба рабіць, каб палепшыць нашу буйную рагатую жывёлу, сьвіней і птушку.

Трэба лепш гадаваць і ўтрымоўваць, лепш карміць.

У тых умовах, у якіх у нас гадуецца жывёла, чакаць ад яе прыбытку нельга.

Каровы ўтрымоўваюцца ў халодных, цёмных і брудных хлявох. Зімою жывёла траціць шмат свайго ўнутранага цяпла, каб сагрэцца ў халодным хляве. Каб падтрымаць страты арганізму на саграваньне, трэба жывёлу больш карміць. А мы ведаем, што ў пераважнай большасьці сялянскіх гаспадарак, асабліва бядняцкіх, корму не хапае, да і тый, які ёсьць, ня вельмі спажыўны, а таму жывёла за зіму худзее, дае менш малака і горшай якасьці, таксама ад бруду, цемнаты і холаду жывёла часта хварэе, што дрэнна адбіваецца ня толькі на яе прадукцыйнасьці, але і на якасьці прыплоду.

Вось чаму трэба трымаць жывёлу (буйнае рагатае быдла, сьвіней, птушку) у цёплых, сьветлых, чыстых і сухіх памяшканьнях.

Жывёлу трэба карміць па нормах; нельга перакарміваць, бо перакормленая карова, птушка пачынае жырэць і спыняе даваць малако і нясьці яйкі. Трэба ведаць колькі задаваць корму і калі.

Мы ведаем, што карова падвышае сваю ўдойнасьць у два разы, калі нават толькі на працягу 10 дзён зьмяніць кармавы ражым, г. зн., харчаваць пэўнымі кармамі па пэўных нормах і ў вызначаны час.

Цяпер наконт кармоў. Кармоў у нас наогул не хапае, ёсьць тякія гаспадаркі, у якіх не хапае на палову, а то і больш кармоў. Пагэтаму трэба пашырыць пасеў кармавых расьлін.

У першую чаргу трэба паляпшаць сенажаці*), уводзіць пасеў кармавых траў, засяваць кораньплоды. Трэба забясьпечыць жывёлу макухай і высяўкамі і інш.

---

*) Чытайце лістоўку „як палепшыць сенажаць", выданую НКЗ і Беларускім Саюзам малочна-жывёлагадоўчай каапэрацыі, яна разаслана па ўсіх малочных т-вах і хатах-чытальнях.

Толькі праз вытворчую кааперацыю можна палепшыць жывёлаводную гаспадарку. А таму трэба ўваходзіць у малочна-жывёлагадоўчыя т-вы. Такіх таварыстваў у нас па БССР зараз налічваецца звыш 400 з 5.000 сялянскіх гаспадарак.

Наша жывёлагадоўля павінна мець малочны напрамак, так як малочная гаспадарка, правільна пастаўленая, вельмі хутка падвышае прыбытковасьць сялянскай гаспадаркі і дапамагае ўзьняцьцю прадукцыйнасьці буйнай рагатай жывёлы.

Вось чаму малочна-жывёлагадоўчая кааперацыя ўдзяляе значную ўвагу перапрацоўцы малочных прадуктаў.

Малочна-жывёлагадоўчае т-ва арганізоўвае зьліўныя і сьліўкаў-аддзяліцельныя пункты і будуе масла-сыраробныя заводы. Збываючы ў т-вы малако, кожная кааперараваная гаспадарка атрымоўвае за яго рэгулярна грошы, атрымоўвае канцэнтраваныя кармы, якія падвышаюць колькасьць, якасьць і тлушч малака. Т-вы арганізоўваюць злучныя пункты з лепшымі вытворнікамі, каб палепшыць жывёлу. Т-вы будуць дапамагаць атрымоўваць на льготных умовах крэдыт *) на пабудову і прыстасаваньне цёплых і сьветлых хлявоў, сьвінарнікаў, птушатнікаў. Т-вы будуць дапамагаць атрымоўваць насеньне кармавых траў і кораньплодаў. Пры т-вах будуць кантроль-асістэнты, якія будуць сачыць за гадоўляй жывёлы, за яе ўтрыманьнем, харчаваньнем і г. д.

Т-вы будуць вясьці збыт усіх прадуктаў жывёлагадоўлі і задавальняць кааперараныя гаспадаркі тымі рэчамі, якія патрэбны для вядзеньня і палепшаньня жывёлаводнай, малочнай і птушніцкай гаспадаркі.

Т-вы будуць весьці культурна-асьветную работу сярод пайшчыкаў.

А якую-ж ролю павінна адыграць сялянка ў разьвіцьці і палепшаньні ня толькі свае гаспадаркі, але ў разьвіцьці і палепшаньні малочна-жывёлагадоўчай кааперацыі.

Зразумела, што сялянка, якая ў значнай ступені ўдзельнічае сваей працай у гаспадарцы наогул, а ў гадоўлі жывёлы амаль выключна, павінна прыняць самы актыўны і шчыры ўдзел у рабоце малочна-жывёлагадоўчых таварыстваў.

(Працяг будзе).

---

*) Ёсьць пастанова Ўраду СССР аб доўгатэрміновым крэдыце на дравясіну для пабудовы цёплых хлявоў.

Чырвоны абоз

(*Апавяданьне Галкі*).

Ціхон першым голас падаў за чырвоны абоз. Як ён адважыўся гаварыць перад усім сходам—ён і сам пасьля доўга таго не ўяўляў. Памятаў толькі Ціхон, як моцна сьціскаў дудкаю скручаную газэціну, якую надысь ён зьлямзіў у раёне, калі быў на батрацкай канфэрэнцыі.

На вясковым сходзе гэта была яго першая прамова. З няпрывычкі паскорана калацілася сэрца, ня зусім складна вязаліся словы, крыху нэрвова сьціскаўся кулак, а ў ім—газэціна.

„Во, гэта выручыць, не падвядзе—ўнутраны голас падбухторваў Ціхона. Калі заблытаюся, ня здолею давесьці,— прачытаю друкаванае".

— Які там абоз, чаму менавіта скопам трэба везьці?—абазваўся нехта.

— Абоз, я-ж кажу—хлебны, а чаму гуртом везьці — я зараз прачытаю.

Ціхон пасунуў бліжэй лямпу, разгарнуў газэтную дудку і, ледзь разьбіраючы зацертыя потнымі рукамі літары, прачытаў, што Падгорышча на дзевятнаццаці хурманках адвезла хлеб у каператыў.

Далейшую чытанку заглушылі галасы.

— Няхай вязуць і дваццаты воз. Нам ад дурняў ня вучыцца—басіў Ігнат.

— Я сама сабе гаспадыня, каму захочу, таму і прадам. Каперацыя, падумаеш! Я на рынку даражэй вазьму, чым у тваім хвалёным каператыве—бурчэла Настуля.

— Эт, знайшлі каго слухаць—блазьнюка, галайстру. Час дамоў. Мне пакуль задыбаеш да хутара. Хадзем хлопцы —гукнуў Гарась.

— Ідзі сабе, скацеркаю дарога. І без цябе вырашым. Дык як дзядзькі?—запытаў Ціхон.

Сход сьціх. Спыніўся на паўдарозе, сярод хаты і Гарась, убачыўшы, што людзі не расходзяцца.

— Прыстаў бы смала. Адкуль ты ўзяўся такі разумны? „Павязем, павязем". Што-ж ты павяжеш, багата намалаціў сёлета. Мо на чаране печы насеяў.

Хтось зарагатаў.

Ціхона зачапіла насьмешка Гарася. Ён зараз успомніў, што сапраўды няма чаго везьці. Але сказаць „павязем" мацней як „вязіце". Ціхон абвёў вачыма людзей, нібы чакаючы хто-б яго падтрымаў. Яго вочы спыніліся на мацеры. Тэкля стаяла каля самага вушака, паглядала на сына. Як ніколі Ціхону захацелася перамагчы.

— Твае малаціў, зарабіў у цябе, а зараз—павязу, здам каператыву—выразна адказаў Гарасіму Ціхон. Так, мама?

— Павезьці не павязем—каня няма; ад людзей таксама не адстанем. На суседзкім вазу адашлём, што маем,—адказала Тэкля.

Такога адказу ніхто не чакаў. Вёска ведала, што хлапец з маткаю жыве з мазаля: заробяць—зьядзяць. А тут на тебе—знайшоўся хлеб, каб у каператыў здаваць.

Далей крыць было нечым. Неспадзеваны адказ Ціхона выбіў грунт з-пад ног Гарася. Ігнат не здаваўся. Ён падштурхнуў жонку Гарася—Лісавету, нешта шапнуў ей на вуха. Тая раптам запытала.

— А чаму-ж гуртом трэба везьці, а не паасобку кожнаму?

„Вось, каб Алекса сюды — падумаў Ціхон—тая-б давяла".

А ў голас адказаў.—Ня мы першыя. Возяць людзі. У мяне тут напісана, дайце прачытаем.

— Дык ты вось як, вязеш і сам ня ведаеш куды. Досыць байкі слухаць, хадзем дамоў.

Людзі пачалі расходзіцца.

* * *

Хут-ко-да-моў, хут-ко-да-моў—выбіваюць калёсы цягніка. Бягуць удаль слупы, загоны, дрэвы.

— Раз, два, тры, чатыры, пяць—лічыць Алекса, паглядаючы ў вакно. І заўсёды на пятым разе прамільгне новы слух. Усе яны аднолькавыя, шэрыя, з белымі кухлямі, дванаццацьцю драцяных нітак злучаны між сабою. Але чамусьці хочацца глядзець мэханічна лічыць слупы, любавацца прасторам, які так хванаберыста пакручваецца загонамі.

Алекса і рада, што прасторы так шпарка бягуць. Паўгода... Гэта-ж трэба, паўгода ня быць у вёсцы, у якой радзілася, неразлучна пражыла 31 год.

Абралі яе на раённы зьезд, там на акруговы. А тут—абралі ў склад Акрвыканкому.

— Ну што-ж, абралі—дык абралі—думала Алекса пасьля зьезду, сабралася з усей дэлегацыяй і—дамоў.

Але ўрэшце паперку прыслалі, у якой з вялікім зьдзіўленьнем Алекса прачытала, што яе як сябра Акрвыканкому адклікаюць на сталую працу ў вакругу. Боязна было спачатку, але паехала.

— Што-ж я буду рабіць тут?—запытала. — Сярпом то я ўмею ўладаць, а вось да алоўку нязвычна рука.

А нам як раз трэба такія, хто дружыць з сярпом. Не хвалюйцеся, т. Паддубава. У савеце

працавалі, зразумееце і гэту працу, а мы дапаможам.

Мабыць так і трэба—падумала Алекса. Абралі ж людзі, і засталася працаваць у горадзе. Час-ад-часу яна бачылася з землякамі—прыязджалі па справам.

— Ну, як жывеце? Ці часта бываюць з савету, як дзялілі насеньне, хто крэдыт атрымаў, як з прырэзкамі?—цікавілася Алекса і тут-ж дадавала:—Ці паздаравела дзяўчынка Міхаліна? Зьмі-цер ажаніўся з Гэляй?

— Вядома як жывем, як у лесе блудзім. Ніхто толкам не раскажа аб тым, што робіцца, аб парадках. Сходы раз ў паўгода бываюць і то—што там скажа Гарась з Ігнатам—тое і будзе. Іх ціхенька клянуць, а ўвочы супраць ніхто ня ідзе.

— А чаго вы іх слухаеце, ці яны-ж на вас дбаюць!—гаварыла Алекса.

— Як-жа супраць ісьці? А жаць, касіць, малаціць да каго пойдзеш; каня, плуга хто пазычыць, хлеба ўвясну хто дасьць?

Так гаварылі сяляне. Алекса ведала, што словам тут справу не пераробіш. Вёска Ракітаўка далёка адкінута ад раёну і нават савету. Сходы беднаты тут праводзяцца толькі перад перавыбарамі савету, таму беднота не арганізавана, гуртом ня выступіць супраць заможнікаў, а ў адзінку кожны ня хоча ворага нажываць. Зараз, гледзячы ў вакно вагона, Алекса ўспамінала ўсё гэта, вяўляла сваю вёску, мяркавала як будзе гутарыць з беднатою.

А як прыме мяне вёска?—задавала яна сама сабе пытаньне. Ужо паўгода ня была.

Зароў гудок паравозу. Мінулі рэчку, у вакне мазнуліся жоўтыя будынкі станцыі.

Да вёскі 12 кілёмэтраў.

— Алекса Пятроўна, як маецеся. Не ганьбуйце маёю хурманкаю, сядайце давязу—увіваўся хурман Васіль.—Сядай і ты Платон!

Закульгалі па няроўнай дарозе. Падкідаючы зады, коні імчаліся ў Ракітаўку.

— Нішто зарабляеце?

— Дзе там! Падарожнікаў мала, аўёс дарагі, ды і ня кожнага разу ехаць прыходзіцца. Учора на сходзе прасядзелі да пеўняў.

— Аб чым сход быў?—запытала Алекса.

— Аб розным гаварылі, а пасьля...Ну, і дзівак гэты Ціхон. Недзе вычытаў, што Падгарчане гуртом хлеба ў каперацыю завезьлі, абоз значыць такі. Пачаў ён намаўляць, каб і Ракітаўцы тое-ж зрабілі.

— Эй, куды прэшся! Асьлеп ці што? Вярні з дарогі пакуль атосы не ўчапіў!—гукнуў Васіль, абганяючы пярэднюю хурманку.

— А ты едзь палюдзку. Дарогі мала яму. Чаго прэшся ўперад?—агрызнуўся пярэдні.

— Табе-ж дбаю. За возам твой конь лепш пабяжыць.

— Ну і што-ж на сходзе, чым кончылі?—цікавіцца Алекса.

— Нічым. Хто паслухае блазьнюка-парабка? Вучыць узяўся! Людзі глядзяць, каб на пудзе лішнюю капейчыну зарабіць. Ціхону што—абы языком лапатаць. Ён хаця-б для сябе хлеба кавалак зарабіў, а ня то што на продаж.

— Не брашы Васіль, — абазваўся Платон. — Ціхон хлапец сумленны. Ні сабе-ж ён у кішэню дбаў. А бачыў як ён вызваўся нават сам здаць што кольвек зароблепае? Ну, і ўдала гэтым абсек Гарася Алекса Пятроўна! Ня было чым крыць Гарасю—падтуліўся і маўчаў.

— Падумаеш, абсек! Толькі казаў, а каб прышлося, нічога-б не павёз.

— А я кажу,—павёз бы, бо і маці не супярэчыла.

Я таксама з жонкаю меркаваў. Па маему Ціхон правільна гаварыў. У мяне вось зямлі чатыры з паловаю дзесяціны. Небагацька, але што-кольвек заўсёды прадаю; бывае ў каператыў, а бывае і на рынку за капейкаю пагонішся. А на рынку вядома хто скупае—той хто пасьля з беднага тры скуры зьдзярэ. Адной-чы паглядзеў я, якую цану за пуд Тэклі загнулі,—аж жахнуўся, думаю, на чыім гэта мазалю гандляр кішэню набіваў, як не на нашым. Толькі што людзі ў нас такія: адзін другога баіцца, багацейшы бяднейшага душыць, а выглядае—бы ласку робіць.

— А ліха твае мацеры, злуецца Васіль.—Хто-ж гэта такі ў вас бядната, а хто кулакі? У нас ус. беднякі, як адзін. Толькі выдумалі „бядняк", „кулак", каб падатку не плаціць, ды гультаёў пладзіць. А сапраўды ўсё людзі ды і толькі таго. Хто дбае, той і мае. Мо і ты бедны?

— Сказаў-бы я табе, Васіль, моцнае слова, але толькі перад кабецінаю нялоўка. Я—ня бедны, я серадняк. І што-ж думаеш, плачу 30 рублёў падатку і яшчэ заплачу, калі прыдзецца, бо мне лягчэй плаціць 30 рублёў, чымся Тэклі ці Сідару 30 капеяк. А ты кажаш — „усе людзі". Што ты раўня Апанасу, Хвядоры Ціту ды іншы. У цябе пара коней, ты штодня пяцёрку як лёду зарабляеш, а то і больш. У Гарася—млын, у Ігната—ваўначоска, ды парабкоў двое.

„Хто дбае, той мае—кажаш. А хіба той самы Ціхон, Тэкля, Апанас менш гаруе, менш мазалёў мае за цябе? Ты здох-бы,



Праз плот пазіраў Саўка.

каб прышлося столькі цягці як Ціхону. Ведаем вашага брата; крывуеце, што беднаце падатку няма, крэдыт у першую чаргу. Так і трэба. Я вось сёлета таксама крэдыту ўзяў і далі. А я зраблю абарот у гаспадарцы і з падзякаю аддам. Ваш брат злуецца на крэдыты таму, што з яго рук дармавых парабкоў адбіраюць. Мне вось самому, каб не крэдыт, то прышлося-б кланяцца таму-ж Гарасю. А пра беднату і казаць нечага: за кавалак хлеба на Гарасёў ды Ігнатаў пот ліюць.

Заіржалі коні, відаць было, што недалёка вёска.

З чым вы ўсе-ж такі з сходу разышліся?

Адказаў Платон:

— Так і разышліся. Ніхто як належыць не давёў—чаму гуртом везьці, ды і позна было ужо.

— А савет?

— Маўчаў Ягор—сябра савету, бы ў рот вады набраўшы, а на яго гледзячы маўчалі і іншыя. Трэба будзе пагутарыць яшчэ наконт гэтага. Вось ты Алекса зараз дапаможаш.

— Куды пад'ехаць?

— Да дзядзькі Апанаса, вядома.

З хат, праціраючы потныя шыбы, выглядалі ракітаўцы, пазнавалі хто сёньні зьвярнуўся ад цягніка.

— Мама, я раскажу.

— Ты што, ашалела? Адзін родны дзядзька—мой брат, мы з ім двое, як вочы ва лбу. Каб на роднага свайго... А людзі добрыя-а, а што-ж гэта за сьвет такі-і наста-аў, дачка мацеры ня слухае, а на што-ж я цябе на сьвет радзіла—на ўсю хату енчыла старая Марына.

Саліма—дачка Марыны сядзела задумана непадалёк ад вакна. Гаворка з маткаю крыху стаміла яе.

— Ты, мама, сама сябе не шануеш. Дзядзька Гарась табе родны, але ці родная ты яму. Вунь, глянь, уся драбіна клоччам закідана. Для каго прадзеш? Каму сілу аддаеш? Занесла сёньні мяшок клубкоў, а што атрымала за гэта? Каня дадуць паараць ды міску грачанкі з мякінаю.

За што я гарую дзень і ноч?—за кпіны. „Ня так стаў, ня так

Я вам скажу праўду пра дзядзьку.

павярнуўся, ня так вачыма павёў". Дзядзька,—на ліха мне такі дзядзька! Хавае для таго, каб з нас кроў смактаць. Праўду Алекса казала, што ён вораг нам, усёй беднаце.

— А я кажу, што ня выдасі—не здавалася маці.—Куды сама пасьля дзенешся, калі дзядзька хлебам не накорміць.

— Багата ты пад'ела яго хлеба? Каб ня даў Камітэт Узаемадапамогі, ды каператыў—здохлі-б з голаду па дзядзьку. А ў каператыў хто дае? Яны гнояць, хаваюць—дзядзькі з яго хэўраю. Ты пашла-б узімку прадавацца яму на жніво, каб хлеб быў. Ён купляе цябе за кош бульбы. Каператыў-жа танна, а Камітэт Узаемадапамогі дарэмна дае. Дык хто-ж радней з іх—камітэт ці дзядзька?

—Саліма, не саром сябе і мяне.

— Мама, мамачка, едуць, зірні!

Саліма саскочыла і выбегла на вуліцу.

— Ня йдзі, дачухна, кажу табе.

Але Саліма была ўжо далёка, толькі хустка яе міганулася з-за хаты.

Вышла на вуліцу і Марына. Па дарозе забегла да суседкі—Хвядоры. Тая стаяла на калодзе ў сенцах і гарцам сыпала ў мяшок зярно.

— Што ты такая засмучаная?—запытала Хвядора.

— А чаго-ж весяліцца, калі дачка родная ўсё сэрца пераела. Насіла, галасіла, раджала, канала, а зараз таксама пакуты ня менш. Непаслухмянства, сваевольства—вось чаго я дачакалася ад дачкі.

— Ну, завязвай! дапамажы мне на воз уцягці—зьвярнулася Хвядора да сына.

Рыгор панёс мяшок. Праз плот на двор пазіраў Саўка.

— Вязеш?—зьвярнуўся ён, коса пазіраючы.

— Вязу.

— А якую хіндзю сама пасьля есьці будзеш?

— Хлеб буду есьці, а ня хіндзю.

— Баця ў царкве казаў, што год падыходзіць не ўраджайны, галодны.—Трэба запасы рабіць.

— Казаў? А чаму-ж сам мантачыць хлеб дарэмна на пакрыцьцё і агарожу царквы? Дык на царкву давай, а ад капэрацыі—хавай?!

Каля возу ці мала стаяла людзей.

— Што ты думаеш, усё-ж такі варта хлеб у вёсцы прытрымаць, а мы як дурні заўжды слухаем усякага.

— А плуга дзе возьмем, касу, паркалю, цукру. Мо Саўка табе зробіць? Хлеб у горад рабочым павязуць, каб працавалі на фабрыцы і для беднаты патрэбнае пакінуць. Праўда ці не? А то знайшоў каго слухаць—Саўку—старшыню царкоўнага. Яго поп намуштруе, вось ён і брэша.

— Ну чаго там сабраліся. Пад'яжджайце да школы—паклікалі з вуліцы.

На вуліцы бы сьвята якое. Вуліца гнецца ад людзей, старыя і малыя павылазілі. З двароў выяжджаюць хурманкі з паклажаю, адна за аднэю да школы—там збор.

— Хутчэй бы зьбіраліся—неспакоіцца Ціхон—трэба-ж пасьпець. Пералічы каго няма.

— Вядома каго — багатыроў. 50 гаспадароў ужо тут. А вонека Ігнат цягнецца. Пабачым, пабачым з чым ён да нас.

— Эй, хлопцы, пачакай. Вы бачылі, Ігнат Зыгмусяў на два пудзікі расчадрыўся.

— Хто, Ігнат? Дык як яму ня сорам перад намі, багатыр!

— Ня браць яго з сабою? Хай давіцца сваімі пудамі! Гэта-ж адчэпнага толькі. Навошта ён нам, падлабуньваецца толькі, а зярно гноіць!

— Правільна, прэч яго!

— А можа ў чалавека няма больш?—уступіўся нехта.

— І ты, як ён? Не забаронвай, ведаем!

— Браткі, ды я-ж адвёз надойчы—апраўдваецца Ігнат.

— Куды адвёз? Не мані. Тут ніхто не жабруе—вязі палюдзку, ці зусім ня лезь.

Ігнат павярнуў каня дамоў.

— Стройся—скамандаваў нехта.—Паедзем праз Летаўку.

На воз узьлез Пархвен.

— Дзядзькі, тут зноў кажуць пра беднякоў і заможнікаў. Навошта нам гэтыя словы. Вунь пабачце, едзе Гарась; яго таксама заможнікам называюць, а ён цэлых 20 пудоў у абозе вязе. Чаго-ж нам з ім грызьціся.

Праз натаўп працісkалася Саліма. Яна ўзьлезла на воз, рукою навылят адпіхнула Пархвена.

— Ня слухайце, браткі, яго. Пархвен прадаўся кулакам, толькі ўчора ў дзядзькі майго—Гарася гарэлку пілі. Дзядзька падвучыў яго так гаварыць. Я вам скажу праўду пра дзядзьку. Прывёз ён 10 пудоў толькі для вока. Мана, браткі. Запытайце ў Гарася, колькі бочак жыта ён дома пакінуў. А для чаго? Ведаем, ён сам за 3 гады ня зьесьць таго, што хавае.

— І яшчэ я вам скажу. А дзе наш сябра савету? Ён таксама ў хэўры з дзядзькам, у сьпісах запісаў яму 4 кароў, а дзе яшчэ 3?—утаіў, утаіў пару коняй, на хутар да зяця іх прадводзіў. Вось які ён! А пасьля магарыч пілі разам. Я скончыла.

Загаварылі ўсе разам.

— Брэша дзеўка—выкрыкнуў нехта.

— Сам ты брэшаш, а што-ж ня праўда?!

— Годзі галдець, ехать час!

— Ціхаце, хлопцы, трэба вырашыць. Па-маему нам Гарася нечага браць з сабою!

— Выкінуць яго з пайнікаў каператыву, тавараў ніякіх ня даць!

— І стада яго, каб у агульнай чарадзе не хадзіла!

— Правільна, правільна!

— Едзем!

Роўненька выстраіліся 54 хурманкі з хлебам адна за аднэю. Першым ішоў конь Платона, побач—сам Платон і Алекса. На вазу з чырвоным сьцягам сядзела Саліма, побач з ею Ціхон на гармоні наярваў нешта вясёлае.

Сялькоркі „Белрабсялянкі“ паедуць вучыцца.

Адборачнай камісіяй дадзены месцы для паступленьня у гэтым годзе ў Менскі Рабфак 3 актыўным сялькоркам „Беларускай Работніцы і Сялянкі“: т. т. Маркавай Надзі (сялянка Бягомльскага раёну в. Гарэлы Луг), Піскун Марылі (сялянка Сьмілавіцкага раёну в. Раўнапольле) і т. Кілессо Аляксандры (сялянка Быхаўскага раёну).

З суседняга возу пад музыку нехта песьню зацягнуў.

— Гэй, дружна!

Песьня пераходзіла з возу на воз. Чамусьці ўсім хацелася сьпяваць як мага галасьней.

* * *

Зьезд Саветаў. Вялізарны пакой бітком набіты. Алекса вачыма акінула дэлегатаў і ў чацьвертым радзе скмеціла Ціхона, які сядзеў крыху сагнуўшыся—запісваў нешта ў блёк-нот.

Вабіла пагутарыць, распытаць. У перапынку падашла да Ціхона.

— Здароў!

— Здаровенька, Алекса. Як-жа добра, што ўбачыліся. Я меў на ўвазе абавязкова спаткацца з табою. Тады заходзілі да цябе, але сказалі, што ты зноў некуды ў раён выехала.

— Гэта тады, як з абозам?

— Але-ж. Ты мусіць ведаеш аб таварыстве?

Мы тады-ж здалі хлеб, і гуртом машыннае таварыства арганізавалі; унесьлі паі, закупілі машыны. Зараз Гарасю з Ігнатам ня кланяемся,—свае машыны ў таварыстве маем—з гонарам гаварыў Ціхон.

— А дзе зараз Саліма жыве?—запытала Алекса.

— Ты ня ведаеш? Яна тады-ж дзядзьку Гарася пакінула. Годзе—кажа—батрачыць! Пажыла трохі з маткаю, а пасьля прачула, што непадалеч арганізавана камуна. Падала і яна заяву—прынялі. Разам з маткаю пашла ў камуну. Прыходзіла надойчы ў Ракітаўку—здаволена. Зараз і наша беднота мяркуе калгас арганізаваць.

Званок паклікаў дэлегатаў у памяшканьне.

Алекса ціха сядзела сярод дэлегатаў, лавіла асобныя словы прамоўцаў. Але зараз яна была ахоплена новай Ракітаўкай, з машынным таварыствам, падрыхтоўка да аб'яднаньняў у калгас. Успомніла абоз, мільгаліся постаці Ціхона і сьмелай батрачкі Салімы.

Г. А.

Здаюць хлеб у каператыў.

(Рассказ „Непатрэбнае“).

„С кулаком не связывайся“.

Мне кажется, что самое главное в рассказе „Непатрэбнае“—это замужество по материальному расчету.—Вопрос о „пасаге“. Якуб не женится на Мальвине потому, что она бедная; его кулацкие щупальцы стремятся захватить все больше и больше богатства в свое хозяйство. Дитя он постарается „згубіць“, чтоб не отнимать на алименты куска от своего богатства. В Миколе чувствуется новый, рожденный Октябрьской революцией, гражданин советской республики. Мальвина связалась с Якубом, польстилась на его богатство.

Вдумываясь в рассказ, каждая девушка, особенно бедная, должна учесть, что с кулацкими сынками надо ухо держать остро. Пусть рассыпается мелким бесом, пусть горы золотые сулит, знай—кулак тебе не пара, он кровный враг тебе. Лапки у него мягкие, а коготки под лапками очень острые. Для каждой бедной девушки иметь ребенка от сына кулака—своего врага—величайший позор. Пусть этот позор падает на голову Мальвины вдвойне, втройне, потому что в данном случае она изменила не только любимому человеку, но и своему классу. С кулаков алименты присуждать надо более строго, чтоб навсегда отбить у них охоту играть бедными девушками, как кошка мышкой.

А-ба.

г. Минск.

Мальвіну асудзіць, а Якуба пакараць.

Прачытаўшы апавяданьне Галкі „Непатрэбнае“, хачу сказаць наступнае: Калі хлапец з дзяўчынай знаходзяцца ў палавой сувязі, дык яны павінны заўсёды ведаць, што ў выніку можа быць дзіця. Якуб і Мальвіна вінаваты ў тым, што дзіця—як вынік сувязі — аказалася „непатрэбным“ абаім. Якуб думаў падманіць, а Мальвіна выйсьці замуж за багатага.

Мальвіна кажа: „Я сваё адрабіла—радзіла дзіця, а зараз няхай няньчыць, гадуе Якуб“.—Такія маткі заслугоўваюць ганьбы. Сама прырода даручыла карміць дзіця матцы.

Мальвіна зрабіла горш жывёліны, горш сваёй каровы. Карова лізала цялочка, а Мальвіна аддала дзіця на пакуты, на пэўную паступовую сьмерць. Злачынства Мальвіны зусім не акупаецца нават тым, што яна мучылася, хацела ўчуць плач дзіцячы.

Галоўная-ж віна падае на Якуба за тое, што ён давёў Мальвіну да зьвярынага пачуцьця—пакараць бацьку сваім дзіцянём.

Прэч старыя думкі аб тым, што: „Вінавата заўсёды дзяўчына, а хлапец—лег, устаў, атросься ды і панёсься“.—Клапаціцца аб дзіцяці павінны абое бацькі. Не правы тыя, хто ганьбаваў Мальвіну за тое, што радзіла не за мужам. Нават Мікалай заслугоўвае папрока за тое, што любіў Мальвіну, а дзіця яе лічыў памехаю.

Мы перабудоўваем наш быт, імкнемся к таму, каб замест ашуканства была сувязь замацаванаю дружбаю. Якуб падрывае гэты напрамак таму, што ён заможнік, мае буйную гаспадарку, наймае касцоў. Таму найбольш Якуб заслугоўвае кары.

Дэлегатка.

Карпілаўка.

Хорошо, что умер Василек.

Кому нужен плод случайного, необдуманного сближения. Разумеется, он всех вяжет по рукам и ногам. В данном случае он опутал трех и всех сделал несчастными. Сближение Якуба с Мальвиной иначе как случайным назвать нельзя. Мальвина никакого чувства не могла питать к Якубу в то время, как с детства была связана с Миколой и любила его. Якуб—кулак. Мальвина польстилась на богатство в то время, когда с Якуба эта история как с гуся вода... Правильно в конце-концов рассуждают деревенские старухи: „Трэба ведаць было, што хлапец кожны: лёг, ўстаў, атросься ды і панёсься“. А Мальвине не мешало-бы подумать, если не о последствиях, то, по крайней мере, о Миколе, который не переставал ее любить до последнего момента. И чем мстить-то вздумала? Отдала свое родное дитя на медленную и верную гибель. Ведь она мстит себе больше, чем Якубу. То беспокойство, которое „байструк“ чинит Якубу и его матери и даже расхождение его с Настулей, никоим образом не может сравниться с муками матери, которая не может прижать ребенка к сердцу. Исход как раз получился благополучный. Безвинный Василек умер и сразу разрубил узел, который завязал своим появлением на свет. Наивная Мальвина напрасно сожалеет, что потеряла первого сынка. Она должна этому радоваться, ибо раньше или позже „Якубин байструк“ причинил-бы ей не мало слез и горя. Как бы не любил ее Микола, „чужое дитя“ все же поневоле мозолило-бы ему глаза.

В общем рассказ содержит много ценных моментов и должен послужить хорошим уроком для многих наших „Мальвин“, горькими слезами оплакивающих мимолетное безрассудное увлечение.

Г. Дорский.

г. Минск.

От редакции. Редакция печатает письмо Дорского без замечаний, ожидая, что должный ответ ему дадут наши читательницы.

ВЫВУЧАЙЦЕ ПРЫРОДУ

Прырода акаляе нас з усіх бакоў. Чалавек ёсьць частка прыроды. Наш дабрабыт і наша гаспадарка залежаць ад яе, але ў той самы час мы не павінны быць рабамі прыроды. Каб палепшыць сваю гаспадарку, каб хутчэй пабудаваць сацыялізм, нам неабходна навучыцца кіраваць прыродай, а гэта мы здолеем зрабіць толькі тады, калі добра будзем разумець яе зьявы.

Першабытны чалавек быў рабом прыроды. Яе зьявы для яго былі загадкай, але ў той самы час у яго мелася моцнае імкненьне разьвязаць гэту загадку. Вось дзякуючы чаму ён стаў па-свойму, падзікарскі, тлумачыць гэтыя зьявы. Вынікам чаго і зьявілася вера ў багоў, чарцей, ведзьмаў, лясуноў, русалак і г. д. Чалавек кленчыў, маліўся, прыносіў розныя ахвяры сваім вымышленым багам. Злы пярун зрабіўся самым галоўным богам. Сонца, дождж, вецер, вада, агонь, лес, некаторыя жывёлы і расьліны ператварыліся ў думцы чалавека ў багоў. Наогул уся прырода, усе яе зьявы сталі багамі першабытнага чалавека.

Гром і маланка.

Паглядзімо, як жа сучасны чалавек разумее зьявы прыроды і тлумачыць іх. Дзеля прыклада возьмем гром і маланку.

У цёмных глухіх вёсках вы і зараз сустрэнеце няпісьменных людзей, якія вераць, што сьвяты Ільля ездзіць па небу ў сваёй каламажцы і грукам яе кол утварае гром. Часам ён пугай паганяе сваіх коняй, а ў гэты момант мы бачым маланку.

Вучоныя добра даведаліся, што такое пярун, гром і маланка, як з імі змагацца і нават як скарыстоўваць іх дзеля сваіх патрэб.

Усе вы чулі пра электрычнасьць. **Дзякуючы ёй і адбываецца ў прыродзе грозная зьява.** Маланка і гром ні Ільля, ні які-небудзь другі бог тут ня ўдзельнічаюць. Электрычнасьць утвараецца пры трэньні.

Калі мы возьмем гумавую ці шкляную палачку і пачнем паціраць іх, дык на гэтых палачках утвараецца электрычнасьць. Палачкі атрымаюць здольнасьць прыцягваць да сябе лёгкія рэчы, напрыклад: ласкуткі паперы, валаскі і інш. Шкляную палачку патрэбна паціраць аб шоўк, аб сюргуч, ці гуму, аб сукно. Пры гэтым будзе зьяўляцца электрычнасьць ня толькі па палачках, але на сукне і на шоўку. Гэтыя розныя электрычнасьці маюць імкненьне злучацца паміж сабой. Пры гэтым злучэньні ўтвараецца іскра. Гэта іскра з вялікай сілай прабівае паветра і сваёй цяплынёй награвае яго Паветра пры гэтым уздрыгаецца, і мы гэты ўздрыг чуем, як гром. У той самы час мы бачым іскру, ці правідловей сьлед ад яе, і зьяву гэту называем маланкай.

Гром і маланка адбываюцца заўсёды адначасова. Зараз можна сабе ўявіць такую рэч. Дзьве тучы наэлектрызаваны рознай электрычнасьцю. Зразумела, што, калі такія тучы злучаюцца, дык праіс-ходзіць зьява, якую мы і называем громам і маланкай.

Тут перад намі паўстаюць наступныя пытаньні: 1) „Калі гром і маланка адбываюцца адначасова, дык чаму-ж мы ў прыродзе назіраем спачатку маланку і толькі праз некаторы тэрмін чуем гром. Бываюць нават і такія выпадкі, што маланку бачым, а гром адсутнічае".

2) „Адкуль узялася электрычнасьць у тучах ці ў зямлі".

Адкажу спачатку на першае пытаньне. Гэта зьява тлумачыцца тым, што сьвятлу ад іскры і зыку ад уздрыжэньні паветра патрэбна праходзіць значную адлегласьць. Сьвятло значна хутчэй за зык далятае да нас. Вось чаму мы раней бачым маланку, а пасьля чуем гром.

Калі-ж мы бачым маланку бяз грому, дык гэта гавора нам аб тым, што зьява адбываецца так далёка ад нас, што ўздрыг паветра не дасягае да нашых вушэй, а губляецца дзе-та ў абшары.

На другое пытаньне: „Адкуль узялася электрычнасьць у тучах". Скажу наступнае. Навальніца, як вам знаёма, здараецца ў вельмі цёплыя дні. Перад навальніцай сонца пячэ невынасіма. Вучоныя мяркуюць, што сонца дзейнічае на паветра і ўтварае ў вышыні электрычнасьць, якая зьбіраецца і затрымліваецца часова ў тучах.

Вам прыходзілася мусі ў цёмным пакоі перад люстрай часаць свае валасы гумовым грабянём. Вы бачылі, як паміж грабнём і вашымі валасамі ўтварыліся маленькія іскры і чуцен быў трэск, гэта на грабяні і валасох утварылася электрычнасьць, якая злучылася паміж сабой чуць прыкметнымі ў люстэрку іскрамі.

Зараз вы дагадаецеся, што тут у вас адбываецца тая самая зьява прыроды, якую мы называем громам і маланкай, толькі тут колькасьць электрычнасьці вельмі маленькая параўнаўчы з колькасьцю электрычнасьці ў тучах. Папрабуйце ў цёмным сухім пакоі сухой рукой пагладзіцьката. Ці не заўважыце знаёмай вам зьявы.

У другі раз мы пагутарым аб тым, як уберагчыся ад пяруна і як чалавек скарыстаў электрычнасьць дзеля сваіх патрэб.

А. Поляк.

НА ВОЗЕРЫ.

СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА

Зьнішчайце шкоднікаў паляводзтва.

Азімая начніца—адзін з галоўных шкоднікаў паляводзтва. Разьвіваецца начніца так: дарослыя вусені зімуюць у зямлі. Як толькі растае сьнег, вусені паяўляюцца на палёх і хутка робяцца чырвона-бурай лялечкай, з якой у чэрвені месяцы вылятае шэры матыль. Самкі матылёў уначы кладуць маленькія яечкі, па аднаму на лісьце пустазельля падарожніка, юнка і асоту. Адзін матыль можа пакласьці да 300 яечак. Дзён праз 10 з іх выходзяць маленькія чарвячкі-вусені, якія жывуць на пустазельлі, спажываюцца яго лісьцем.

Зрабіўшыся дарослымі, яны на працягу дню хаваюцца ў каменьнях зямлі, пад сухімі лісьцямі, а ядуць уначы.

К часу пасеву азімых—вусені дасягаюць поўнага ўзросту, ахварбоўваюцца ў зямліста-шэры, а інады ў зялёны колер і на працягу дню зарываюцца ў зямлю. Уначы яны ядуць усходы азімых. Па наяўнасьці пашкоджаных пасеваў, можна ведаць, што на полі завёўся шкоднік. Засьмечанасьць сялянскага папару пустазельлем спрыяе расплоджваньню шкодніка. На гэтых папарах кладзе яечкі начніца, а вусені, якія выходзяць з іх, знаходзяць сабе прытулак.

Каб папярэдзіць паяўленьне шкоднікаў на азімых, неабходна праз правільную апрацоўку папара сваечасова зьнішчаць пустазельле. Лепшым папарам зьяўляецца чорны, да апрацоўкі прыступаюць увосень і вясною падвайваюць; на працягу лета скародзяць, калі зьяўляецца пустазельле. Вельмі добрай мерай барацьбы з азімым чэрвям зьяўляецца аўсяна-вікавы папар, пры якім поле засяваецца віка-аўсянай мешанінай, якую трэба выскаваць з разьлікам, каб да сярэдзіны чэрвеня яна ўзрасла і заглушыла пустазельле. І ўбіраць не раней 10 ліпеня.

Сорныя травы, якія растуць на межах, канавах, неабходна таксама зьнішчаць абкашваючы іх з 15 чэрвеня да 15 ліпеня, у час лёту матылей.

Каб забараніць поле ад напаўзаючых вусеняў, трэба па бакох яго правесьці ахоўныя канаўкі, якія робяцца пры дапамозе плуга, а пасьля падраўніваюцца рыдлёўкаю—выкідаюць зямлю ў бок руху шкодніка. Глыбіня канавы павінна быць ня менш 27 санцімэтраў (6 вяршкоў), а шырыня—5 вяршкоў. Сьцены канавы павінны быць адвеснымі, а на дне капаюць студню ў 18 см. (4 вяршкі); на пяшчанай глебе канавы робяць глыбінёю 18 вяршкоў. Трэба наглядаць за сапраўднасьцю канавак і адначасова штодзенна зьнішчаць у іх вусень.

Калі вусені распаўзьліся па полю, неабходна іх зьнішчаць шляхам апыльваньня азімых—атрутамі: парыскай зеленьню ці мыш'яком. На гэктар трэба браць 3—4 кілёграмы атруты, перамяшаць яе з 20—30 кілёграм гашанае вапны ці попелу. Апыльваць поле лепш за ўсё трэба пры дапамозе асобнага апарату—распыліцеля. Яшчэ можна зьнішчаць вусеня атручанымі прыладамі, якія можна таксама ўжываць для пасеву азімых. Раскідваецца па полю кучкамі канюшына, намочаная ў наступнай рашчыне: 50 гр. зелені, 150 гр. вапны, разведзенайі ў 12 літрах вады.

У дажджлівыя гады на палёх паяўляецца **„палёвы смоўж"**, які шкодзіць азімым. Каб абараніцца ад гэтага шкодніка, трэба абвесьці пасевы канавамі. Дно канаўкі трэба пасыпаць попелам, вапнаю і іншымі едкімі сродкамі.

Карысна рабіць апырскваньне заражоных пасеваў рашчынам жалезнага купарвасу 1200 гр. на 1 вядро вады.

Соўка-гама-вусень (ільняны чарвяк)—гэта небясьпечны шкоднік ільну. Матыль Соўкі-гамы паяўляецца а другой палове чэрвеня, як удзень, так і ўначы, кладзе яечкі на пустазельле, з якіх праз некалькі дзён выходзяць маленькія вусянічкі, перапаўзаючыя пасьля на лён. Жыцьцё вусені працягваецца каля месяцу, пасьля чаго яны ператвараюцца ў лялечкі.

Змагацца з гэтым вусеням трэба так: зьнішчаць пустазельле на полі і межах, гэтым губяцца адкладзеныя шкоднікам яйкі. Палоць і абкашваць травы трэба да пачатку лёту матылёў, палоць трэба тады, калі вышыня лёну дасягнула 2—3 вяршкі. Яшчэ неабходна акапваць поле канаўкамі. Калі-ж вусень ужо завялася, неабходна апырсківаць лён парыскай зеленьню. 12 гр. (3 залатнікі) і 6 гр. вапны на 1 вядро вады, ці хлёрыстым барыям 60 гр. на вядро вады.

Ільняная блыха—другі небясьпечны шкоднік ільну, яна нападае на маладыя ўсходы. Змагацца з блошкаю трэба так: пасыпаць усходы попелам, распушчанай вапнай, тутуным пылам. Пасыпаць трэба раніцаю, на расе. Гэта дапамагае, але не заўсёды. Трэба апырскваць пасевы парыскай зеленьню—у тэй дазыроўцы, як яе ўжываюць у барацьбе з азімым чэрвям.

ВЭТЭРЫНАРЫЯ

Як ратаваць атручаную шкоднаю травою жывёлу.

Сярод траў, што растуць на нашых сенажацях, пашах і выгонах, сустракаецца шмат шкодных. Адны з іх дрэнна ўплываюць на мазгі і нэрвы, а другія—на жывот і страваваньне.

Да шкодных траў і расьлін, што шкодзяць жывёле на мазгі і нэрвы, належаць: блёкат, красаўка, кукаль, хвошч, салата атрутная, дурнап'ян і інш. (глядзі малюнак 1, 2).

На жывот і страваваньне шкодзяць: ялавец (ягады) малагай, чамярыца, падтыньнік і інш.—усе яны выклікаюць у жывёлы запаленьне ў страўніку і кішках.

Аднак, трэба заўважыць, што многія з гэтых расьлін, высушаныя ў сене, робяцца ўжо ня шкоднымі, так напр. усім вядома расьліна з невялікімі жоўценькімі кветкамі, якую завуць курасьлеп,—сырая на корані, яна шкодная, а высушаная—траціць сваю шкадлівасьць. Але шмат якія шкодныя расьліны, вельмі небясьпечныя, яны застаюцца шкоднымі таксама і ў сене.

Як пазнаць атруціўшуюся жывёлу.

Атруціўшаяся шкоднаю травою жывёла адразу перастае есьці і ў яе адразу прападае жуйка, а з роту паказваецца пена. Жывёла з вялікаю труднасьцю пачынае глытаць, дрыжыць усім целам і пацее. Далей у яе пачынаецца ірвота часамі нават з кроўю; калі націснуць такой атручанай жывёле рукою ў крыжы, дык яна адчувае ў ім боль і прысядае. Досыць часта такая жывёла мочыцца кроўю, стаіць, як прыбітая, альбо наадварот—вельмі непакоіцца. Пры моцным атручаньні часта бывае паралюш заду і інш. зьявы з боку нэрвовае сыстэмы.

Што трэба рабіць з такою жывёлай.

Першае, што трэба кожнаму гаспадару зрабіць з атруціўшайся жывёлай—гэта затрымаць яе дома і ня пусьціць на пашу, а калі гэта здарыцца ўзімку, дык зараз-жа зьмяніць сена. Карысна адразу абцерці ўсё цела жывёлы халоднай вадою, а ў сярэдзіну даць бутэльку алею і паставіць клізму з адвару насеньня ільну. Потым жывёле даюць каля 1/2 ф. гляўбэрскай солі ў бутэльцы адвару з насеньня ільну, 2 разы на дзень.

Калі пакажацца ў каровы мача з кроўю, дык гэта значыць, што атрута пашкодзіла ныркі, і тады трэба прыкладаць на паясьніцу халодныя прымочкі з вады. У сярэдзіну даюць пры гэтым адвар з насеньня ільну. Калі-ж у жывёлы часамі адыме зад, і яна пачынае хадзіць хістаючыся, дык трэба даваць шкіпінар з адварам насеньня ільну (1 гарб. лыжачку шкіпінару на бутэльку адвару, праз кожныя 3—4 гадзіны).

Як папярэдзіць атручаньне жывёлы на пашы.

Каб папярэдзіць атручаньне жывёлы на пашы, ня трэба сьпяшацца з раньнім выгонам вясной Гэтым мы і жывёлу захаваем і пашу палепшым, бо раньні выган вельмі шкодзіць пашы, дзякуючы таму, што жывёла ўтоптвае ў зямлю лепшыя маладыя яшчэ травы. Па-другое, трэба абавязкова кожны дзень падкармліваць жывёлу ў хляву якімколечы кормам, каб яна адразу не накідвалася на пашы на абы якую траву, а выбірала лепшую. Нарэшце, абавязкова належыць праводзіць як найхутчэй культуру сенажацяй і выганаў, бо гэта адно толькі можа пазбавіць іх ад шкодных расьлін.

Вэтэрынарны ўрач М. Жарын.

КАРЫСНЫЯ ПАРАДЫ.

Каб мяса не псавалася.

На 12—15 хунтаў мяса ялавічага, сьвініны ці бараніны трэба ўзяць хунт солі, паўлыжкі салітры, 20—30 лаўровых лісточкаў, палова маленькай лыжачкі гвазьдзікі і столькі-ж перцу. Усё гэта трэба перамяшаць і пасьля нацерці гэтым добра памытае мяса. Пасьля мяса складаюць у чыстую пасудзіну і зьверху накладаюць гнёт. Мяса трэба захоўваць у халодным месцы, і час-ад-часу паліваць яго сокам, які выпускае мяса. Зачыняць бочку з мясам трэба добра, але так, каб быў доступ паветра, бо інакш мяса пачне хутка псавацца.

Как уничтожить запах краски.

Чтобы в ново-окрашенной посуде не было запаха краски, нужно положить в них клок сена, залить водой и оставить так на сутки. Потом сено и воду переменить и держать еще сутки. После этого уничтожается неприятный запах краски.

Пра брусьніцы. *(Парада сялянкі Хаміцкай, в. Скураты).*

Сьпелыя брусьніцы трэба скласьці ў гліняны гаршок і паставіць у негарачую печ (пасьля хлеба). Брусьніцы павінны стаяць да раніцы. Пасьля трэба добра вымешаць, скласьці ў слоік, даць пастаяць у печы пакуль з верху зробіцца скарынка—ад гэтага узімку брусьніцы не пакрываюцца цьвіллю. Потым слой абвязаць чыстаю анучкаю і хаваць у халодным, сухім месцы (толькі не на марозе).

А можна брусьніцы гатаваць яшчэ і так: сьпелыя брусьніцы скласьці ў медніцу і варыць на пліце, ці на трыножку на малым агні, увесь час мяшаючы. Варыць трэба ў брусьнічным саку. Калі брусьніцы пагусьцеюць—скласьці у слоік і хаваць як і першыя.

Ад рэдакцыі. Работніцы і Сялянкі. Прысылайце матар'ял у аддзел „Карысныя Парады", для таго, каб перадаць ваш вопыт умела гаспадарыць.

Гадуйце здаровых дзяцей

ЛЕТНИЙ ДЕНЬ ГАРИКА.

Пробило 7 час. В комнате раздался плач... Ма-а-м-ма... М-а-а-а-ма... Я встать хочу... Некогда мне с тобою возиться, лежи, а то так отклепаю, что помнить будешь—крикнула мама, суетясь около печки.

Испугался Гарик маминого крика, зарылся в одеяло и молчит.

А на улице так хорошо. Через открытое окно доносятся веселые голоса ребят, так приятно ласкает солнышко, хотелось бы встать да побежать в огород, посмотреть выросла ли редиска за ночь, а мама говорит спи. Обидно. Но ничего не поделаешь. Лежит Гарик. Пробило 9, в комнате опять рев. „Ма-а-ма голова болит, ма-а-а-ма", а сам бледный, бледный и все плачет. Испугалась мама и скорей стала Гарика одевать. Штанишки одела, рубашенку наглухо застегнула, что-б не простудился. „Мне жарко плачет Гарик, не хочу ру-у-башечку"... Но мама и слушать не желает.

— „Ты что простудиться захотел. Нельзя без рубашки. Закапризничал Гарик вконец и даже есть не хочет, а мама настаивает, что-б мяса с картошкой поел, что от обеда вчерашнего осталось.

— „Вот оттого, что не ешь мяса, ты худой и такой бледный, все-б тебе по улице бегать, да в песке валяться, или на солнце сидеть. Плачет Гарик, надрывается. Не действуют на него мамины уговоры.

Игра на свежем воздухе.

— И что ты за несносный мальчишка. Житья мне с тобой нет! Что мне с тобой делать, а Гарик по полу катается; колотит маленькими ноженками и требует:

— М-а-ма сними рубаше-ч-к-у, мне жарко, мама, не хочу мяса, есть хочу ма-а-ма...

Измоталась Анна с Гариком, никак его не успокоить и решила: „сбегаю-ка я на соседнюю площадку. Там учительница молодая такая, да хорошая, может посоветует, как с ребенком обращаться.

„Уж я за ним, кажись, так слежу, так ухаживаю, а вот ничего ему в пользу не идет, все бледный да худой. У других посмотришь дети, как дети, а у меня не ребенок, а сущее наказание"—жаловалась Арине воспитательнице.

— А знаете, товарищ, отчего вам с ребенком так трудно? Воспитывать вы его не умеете, здоровье ему портите, и прав ребенок, что слушать вас не хочет! Разве можно мальчика летом заставлять спать до 9 час.? В 7 часов вставать надо! По утру воздух чистый, пыли нет, здоровье это для ребенка, а от позднего сна голова болит, аппетит пропадает, вот и капризничает малыш. И не хорошо это, что одеваете вы его по зимнему; боитесь простудится, мол, заболеет. Глупости! Не простудится! Солнце—лучший врач. Оденьте вы ему трусики маленькие и пусть загорит на солнце, увидите и бледность как рукой снимет, и голова болеть не будет: только следите, что-б головка у мальчика была прикрыта, а то солнечный удар может случиться. Мясом по утру кормить не надо, вы бы ему лучше молока дали, а то чаем напоили, да хлеба с маслом нарезали. Овощами, фруктами, ягодами кормите; в этих продуктах железа много, и ребята крепнут от этой пищи.

Натрите полотенцем тело Гарика, а потом пусть на солнце побегает. Часов в 10 опять покормите; каши манной ему дайте, а то кофе сварите и пусть играет на дворе, где нибудь в тени; песку желтого насыпьте, да коробок разных соберите—мало ли их дома валяется—дайте ребенку, пусть забавляется. Или веревок достаньте, пусть с товарищами в лошадки играет.

После 2-х часов положите вы сына спать. Пусть часа 2 отдохнет. В 6 часов покормите, а в 8 укладывайте спать. Перед сном ноги вымойте и следите, чтобы ребенок в чистом ходил.

Вот, если вы будете так ухаживать за сыном, у ребенка капризы пропадут и здоровым будет.

Бэла Левитан.

На мою жонку не смей смотреть

„На словах то ты хорош,
а на деле—к чорту гож“—
говорит пословица метко,
четко и едко
по адресу
тех, кто о чистоте распинается,
а сам в грязи валяется.
И верно,
потому, пахнет от таких людей
прескверно; прямо дохлятиной
несет.
Вот вам случай, когда дело идет
не за словом,
а наоборот.
Послушайте как на заводе
„Новка“
в выдвижении работниц вышла
остановка.
Рабочий—Попиневский Игнат
стараваt, не из мальчишек;
имеет коммунистку—жену
и четверо ребятишек.
(Это сейчас при нем четверо
а сколько на стороне—
неизвестно).
Добавить не безинтересно,
что только лишь год тому назад
наш почтенный папаша—Игнат
бросал больную жену и семью.
Теперь он вернулся к прежней
жене
и как будто хорошо с ней зажил
вполне,
(в семейном положении).
Вдруг „слухи“ пронеслись о
выдвижении.
Игнат соловьем поет:
„Выдвижение—дело большое,
во какое!
Надо работниц выдвигать,
учить большими делами
заправлять.
Долой горшки и пеленки!
(Видите, какие слова звонкие).
Лозунг—выдвижение женщин—
хорош.
А вот мою жену... не трожь!“
И вдруг случилось так ловко:
жена его выдвинута зав. сто-
ловкой.
За ее старания
доверили „маленькое“ дело—
общественное питание.
Выдвиженка старается,
с работой справляется.
Работа загудела.
Работницы довольны — говорят:
„Вот это дело!
Оправдала себя выдвиженка“.
Вдруг глядят
Игнат на дыбы встал,
пить и есть перестал.
Все из-за той причины,
что в столовке на жену
смотрит не он один,
а и другие мужчины.
Игнат жене жить не дает,
кричит, ругает, орет:
„Ты—такая, этакая, распро-
такая!
На тебя повар заглядывает,
Тот подмигивает—глаза косит,
этот—слово забросит“.
Так Игнат выдвиженку журит.



А то просто, дубину в руки—
и в столовке дежурит:
людей отпугивает,
бранит, поругивает.
„Не смейте на жену глаз косить!
А ты, Ева, если не надоело жить,
бросай столовку. Марш домой!“
Ой, ой, ой!
Да что же это в самом деле?
У Игната только бельишко на
голом теле.
Потому, горяч он нутром—
новый костюм изрубил топором.
А потом плакался на свою долю:
Видите-ли, жена отказалась
исполнить его, мужнину волю—
работать продолжает.
Еще пуще Игнат жене допекает,
шагу ступить не дает—
грозит, скандалит, ревет.
Довел до того выдвиженку
нашу—
заставил бросить дело,
вернуться домой,
штопать носки,
варить щи и кашу.
Довольно, хватит самодурства
Игната!
Надо наказать виноватого,
выколотить из него всю дурь
ретивую,
заставить поступать не так, как
хочется ему,
а как нужно коллективу.
А работница нам пишет из
„Новки“:
„Снять выдвиженку из-за
каприза мужа—неудобно.
Закрыть столовку—еще хуже.
Не знаем как выйти из
положения.
Не поможет ли „Белрабсе-
лянка“
в этом отношении“.
Слышали? На помощь зовут
печать!
Можно и так.
Но надо было дело давно начать—
укротить хулигана,
чтобы дело выдвижения не
поганил;
безобразиям конец положить,
коллективом предложить
взяться за ум Игнату.
А не послушает слова—он нам
не друг.
Надо, чтобы общественность
дружно
сказала: „Таких безобразий нам
не нужно“.
Еще строже надо судить Игната
потому,
что уже несколько лет
он носит в кармане партийный
билет.
Надо-бы давно, не ожидая чистки,
избавиться от таких Игнатов,
которые вредят выдвижению
работницы-коммунистки.

Г...а.

Выдавец—Аддзел работніц і сялянак ЦК КП(б)Б. *Рэдактары* { С. Крэмер. М. Меерзон.

НЕТ ЛИ ЗНАКОМЫХ ПОРТРЕТОВ?

— **ПРОДАВЕЦ:—Вы чего очередь устроили?**
— **ПОКУПАТЕЛЬНИЦА:—За лавровым листом. Говорят, что его больше как 200 грамм не отпускают.**
— **ПРОДАВЕЦ:—Да бери сколько хочешь!**
— **ПОКУПАТЕЛЬНИЦА:—Сколько хочу? Ну, тогда не надо.**

(Из журнала „Лапоть“).

Хто-ж дурны?

На такіх дэлегатак прыткіх пазіраць нават брыдка.

„Матруна Малаковіч — дэлегатка з вёскі Карпілаўкі, Глускага раёну. Яна называе дурнямі ўсіх жанчын, якія выпісваюць „Белрабсялянку“. Адкажэце нам хто сапраўды дурны“.

Акуліна і Просья.

Дарэмна Матруна дурнямі кагось абзываеш. Як ты дагэтуль ня знаеш, што розуму той менш мае, хто нічагуткі ня чытае. Кінь свае плёткі, за розум вазьміся і ў Лескаўскіх дэлегатак добраму навучыся.

РАБОТНІЦЫ І СЯЛЯНКІ!

Прысылайце матар'ял у старонку; „Ці няма знаёмых партрэтаў“. Падавайце ў гэту старонку факты аб розных балячках нашай працы і быту.

Няхай у гэтай старонцы будуць апісаны людзі, якія перашкаджаюць працаваць і будаваць новы быт.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА.

Войтак. Вы закранулі важнае пытаньне, але напісалі агульна, не даўшы ніводнага мясцовага прыкладу, таму друкаваць карэспандэнцыі ня будзем.

Вус Акуліне. Пішэце, як удзельнічаюць ў грамадзкай працы жанчыны, скончыўшыя гурток.

Ведаючы. Аб удзеле жанчын у грамадзкіх арганізацыях напішэце ў насьценную газэту.

Работніцы. Аб жэнпрацы на „Дзьвіне“ пераслана ў газэту „Зьвязда“.

М. Чабор. Якую вы праводзіце працу для того, каб Раўнапольскія сялянкі выпісвалі нашу часопісь.

„Зьнішчайце цемру“—друкаваць ня будзем. Пішэце, як апраўдала сябе сялянка ў Народным Судзе.

М. Розе. Які ўдзел прымаюць дэлегаткі ў грамадзкай рабоце вёскі.

Пазарынай. Пішэце, што высьвятлена ў час працы па чыстцы савецкага апарату і які ўдзел прымалі працоўныя—жанчыны.

Арлове М. Р. Напішэце нам больш падрабязна аб росьце гаспадаркі вашай камуны, якія ёсьць посьпехі. Як выконвае камуна загад ураду аб павышэньні ўраджайнасьці.

Захарэнка А. Аб гэтым напішэце ў насьценгазэту.

Каралёвай. Напішэце аб умовах жыцьця камунарак.

Гарбаценка. Пішэце, як праяўляюць сябе на практычнай рабоце жанчыны сябру сельсавету.

Я. Ракіта. „Сварлівы сябра савету“—друкаваць ня будзем. Напішэце ў чым выяўляецца яго сварлівасьць, дайце дакладныя факты.

Байравай. Напішэце, чым дапамагаюць сялянкі дзіцячым яслям.

Матэйка. Напішэце, што практычна робяць жанчыны, абраныя ў савет, якую грамадзкую работу праводзяць актывісткі вашае вёскі.

Уфлянд. Пішэце, як вы скарыстоўваеце „Белрабсялянку“, якая выхаваўчая работа праводзіцца вакол часопісі.

М. Чобар. Нельга ў адным допісу браць некалькі фактаў, як вы гэта зрабілі ў допісу „На дапамогу пагарэльцам“. Трэба ўзяць які-небудзь адзін момант і падрабязна перадаць яго.

Вілейка. Усе лётарэйныя білеты трэба каб падпішчыкі пераслалі ў рэдакцыю, разам з квітком на здачу падпіскі.

Хведаравай. Білеты друкаваліся ў часопісі, а квіток трэба ўзяць ва ўпаўнаважанай, ці няхай яна сама адашле іх ў рэдакцыю разам з агульным квітком.

Падпішчыкі на „Белрабсялянку“!

Розыгрыш абвешчанай намі лётарэі адбудзецца ў нядзелю 4-га жніўня.

Для ўдзелу ў розыгрышы запрошаны прадстаўнікі РСІ, Дому Селяніна і прадстаўнікі падпішчыкаў.

Аб тым, хто атрымае выйгрышы—будзе надрукована ў „Белрабсялянцы“.

Друкарня БДВ. Зак. № 3145. У ліку 11.250. Галоўлітбел № 2052.